Маланухіна С.У., выпускніца ФПКПК
БДУ культуры і мастацтваў.
Навуковы кіраўнік – Ляйко Н.А.,
канд. гіст. навук, прафесар

# ДЗЕЙНАСЦЬ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ПА РАСПАЎСЮДЖАННІ БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасны свет уражвае мноствам і разнастайнасцю інфармацыйных каналаў. Сёння інфармацыя з'яўляецца жыццёвай неабходнасцю, прадвызначае якасць жыцця. Зрабіць інфармацыйныя рэсурсы больш даступнымі для ўсіх грамадзян прызваны публічныя бібліятэкі. Ва ўсе гістарычныя перыяды развіцця грамадства галоўнай мэтай дзейнасці бібліятэк з'яўляецца задавальненне яго інфармацыйных патрэб. Менавіта бібліятэкі спрадвеку займаліся зборам, захоўваннем, сістэматызацыяй і распаўсюджаннем ведаў.

Распад СССР і абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь садзейнічалі адраджэнню нацыянальнай культуры: у краіне пачала часцей выкарыстоўвацца беларуская мова, у бібліятэках з'явіліся новыя формы абслугоўвання карыстальнікаў, якія звязаны з гісторыяй краіны, традыцыямі народа, яго бытам, культурай.

Адной з актуальных праблем на сучасным этапе з'яўляецца дзейнасць бібліятэк па распаўсюджанні беларускай кнігі сярод карыстальнікаў масавых бібліятэк. Дзейнасць бібліятэк ажыццяўляецца ва ўмовах дзяржаўнай падтрымкі. Аб гэтым сведчыць Закон Рэспублікі Беларусь "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь", дзе акрэслены асноўныя прынцыпы дзейнасці бібліятэк, сярод якіх:

– вызначэнне агульначалавечых каштоўнасцей у якасці прыярытэтных;

– садзейнічанне адраджэнню і развіццю культурных традыцый і захаванню каштоўнасцей беларускай нацыі і іншых нацыянальнасцей, якія пражываюць у краіне, захаванасці гісторыка-культурнай спадчыны;

– распаўсюджанне гуманістычных ідэй, навуковых ведаў і дасягненняў сусветнай культуры [1].

Асновай эфектыўнай дзейнасці кожнай бібліятэкі па распаўсюджанні беларускай кнігі з'яўляецца якаснае напаўненне яе інфармацыйных рэсурсаў. Ад складу, аб'ёму і стану бібліятэчных фондаў на беларускай мове залежыць задавальненне запытаў карыстальнікаў. Міністэрства інфармацыі кожны год фарміруе план выпуску сацыяльна значнай літаратуры , неабходнай для ўстаноў адукацыі, навукі і культуры. Пры гэтым улічваюцца прапановы публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры. У план выпуску ўключаюцца кнігі краязнаўчай тэматыкі, па гісторыі, эканоміцы і культуры Беларусі. На працягу двух апошніх год супрацоўніцтва дзяржаўных выдавецтваў і публічных бібліятэк набыло канструктыўны і ўзаемавыгадны характар. Не апошняя роля ў гэтым працэсе належыць Міністэрству культуры Беларусі.

Паводле дадзеных Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, у 2009г. у краіне было выдадзена 1884 назвы кніг на беларускай мове агульным тыражом 5,26 мільёна экзэмпляраў [2]. Кнігі на беларускай мове выдаюць дзяржаўныя выдавецтвы «Мастацкая літаратура», «Народная асвета», «Выдавецкі дом «Беларуская навука», "Беларусь", "Мастацкая літаратура", "Беларуская Энцыклапедыя імя П.Броўкі", "Вышэйшая школа", "Універсітэцкае" і інш. арганізацыі і выдавецтвы разнастайнай формы ўласнасці.

Ужо стала традыцыяй штогод у рамках Дня беларускага пісьменства і Дня бібліятэк, праводзіць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі выстаўку-прэзентацыю па выніках чарговага нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі". Свой ганаровы шлях лепшыя кнігі распачынаюць у Дзень беларускага пісьменства, калі прадстаўнікам выдавецтваў уручаюцца ганаровыя дыпломы і памятны знак-сімвал «Залаты фаліянт». У сёлетнім 49 конкурсе прынялі ўдзел

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

39 выдавецтваў і выдавецкіх арганізацый, якія прапанавалі больш за 200 выданняў павышанай якасці па 23 намінацыях. На гонар беларускім кнігавыдаўцам на VI Міжнародным конкурсе краін СНД "Мастацтва кнігі" сярод 140 выданняў з 9 краін Беларусь атрымала 7 дыпломаў, галоўны з якіх Гран-пры за кнігу "Напалеон Орда. Шлях да Айчыны", выпушчаную выдавецтвам "Мастацкая літаратура". Сярод тэматычных намінацый трэба адзначыць некалькі спецыяльных, характэрных менавіта для 2009 года: выданні, прысвечаныя 600-годдзю ўсталявання запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы, (намінацыя «Скарбы Радзімы»); кнігі, стварэнне якіх прымеркавана да 65-годдзя вызвалення Беларусі, (намінацыя «Вызваленне»); выданні, прысвечаныя Году роднай зямлі, (намінацыя «Зямля мая ...»). У 49 конкурсе «Мастацтва кнігі-2009» Нацыянальная бібліятэка Беларусі атрымала дыплом II ступені ў намінацыі «Лепшы фотаальбом» за кнігу «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» (выдавецтва «Беларусь») і дыплом III ступені ў намінацыі «Лепшае навуковае выданне» за кнігу А.А. Сушы «Даведнік па Беларусі для Імператрыцы» і кнігу-факсіміле «Топографические примечания на знатнейшие места путешествия Ее Императорского Величества в белорусские наместничества» і інш. [3].

Даволі многа пачало выдавацца кніг, прысвечаных культуры і прыродзе зямлі беларускай. Непаўторнасць, унікальнасць архітэктурных помнікаў, прыродных пейзажаў не можа пакінуць абыякавымі не толькі пісьменнікаў, мастакоў і фатографаў, якія ствараюць такія кнігі, але і сучаснага чытача. Працягваецца ажыццяўленне шэрагу важных па змесце і якасных па афармленні выдавецкіх праектаў. Дзякуючы гэтаму, бібліятэкі могуць выкарыстоўваць новую літаратуру пры арганізацыі розных форм работы па распаўсюджанні беларускамоўнай кнігі. Але трэба адзначыць, што чытанне беларускай мастацкай літаратуры і літаратуры на беларускай мове залежыць не толькі ад добра скамплектаваных фондаў бібліятэк, старання бібліятэкараў і іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўкі, не толькі ад работы метадычных цэнтраў , але і ад агульнай пастаноўкі вывучэння роднай мовы ў школе, другіх навучальных установах, адносін да роднай мовы ў сем'ях, агульнай культуры чалавека. Для распаўсюджання беларускай кнігі бібліятэкі выкарыстоўваюць самыя разнастайныя формы. Вялікі размах у рэспубліцы прыняла такая форма работы, як свята беларускай кнігі. Гэта мерапрыемствы комплекснага характару, у якія ўваходзяць абмеркаванні кніг, літаратурныя віктарыны, сустрэчы з пісьменнікамі, выстаўкі дзіцячых малюнкаў.

Мінулае пяцігоддзе характарызуецца далейшым паглыбленнем краязнаўчай дзейнасці. Так, напрыклад, у Мінскай абласной бібліятэцы імя Пушкіна ў 2009 годзе адбыліся такія мерапрыемствы як: “Вандроўка ў родную мову”; у рамках Тыдня Беларускай пісьменнасці і друку прайшла выстава-прагляд “Свята слова і кнігі”; ладзіліся гістарычныя чытанні “Мінск, якога мы не бачылі” і брэйн-рынг “Я ў гэтым горадзе жыву, я гэты горад ведаю”. З мэтай комплекснай папулярызацыі духоўна-мастацкай спадчыны краіны бібліятэкі наладжвалі і падтрымлівалі цесныя сувязі са школамі, краязнаўчымі музеямі, краязнаўцамі і старажыламі свайго краю. Традыцыйным быў удзел публічных бібліятэк у правядзенні штогадовага Рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры". Працягвалася работа па падрыхтоўцы выдання раённых кніг "Памяць", летапісу вёсак, бібліятэк, па арганізацыі выставак вырабаў, твораў народных умельцаў. Самай распаўсюджанай формай прапаганды духоўнага багацця народа з'яўлялася работа аматарскіх аб'яднанняў "Спадчына", якія працуюць пры многіх публічных бібліятэках.

Багацце беларускай літаратуры раскрывалі для чытачоў супрацоўнікі бібліятэк усіх ЦБС рэспублікі. Свой важкі ўклад уносілі бібліятэкі ў літаратурнае краязнаўства: збіралі звесткі аб жыцці і творчасці землякоў-літаратараў, ладзілі вечарыны, святы, прысвечаныя ім, выдавалі буклеты. Самы шырокі водгук у рабоце бібліятэк знаходзілі даты літаратурнага календара. Так,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у Мінскай абласной бібліятэцы імя Пушкіна ў 2009г. былі арганізаваны кніжныя выставы пісьменнікам-юбілярам і літаратуразнаўцам: Янку Нёманскаму, Язэпу Дыле, Анатолю Клышцы, Уладзіміру Мархелю. Карыстальнікі праходзілі сцежкамі жыцця і творчасці знакамітых паэтаў і пісьменнікаў: В. Быкава, І. Чыгрынава, А. Куляшова, У. Караткевіча, М. Карызны, П. Труса, М. Матукоўскага, А. Вольскага, У. Барысенкі, Е. Лось, У. Скарынкіна і інш.

Падводзячы вынік сказанаму, трэба адзначыць, што для многіх бібліятэк комплексныя мерапрыемствы па распаўсюджанні беларускай кнігі сталі адным з асноўных напрамкаў работы. Дынамічныя змены, якія адбываліся з фондамі публічных бібліятэк на беларускай мове на працягу апошніх год уключалі ў сябе як станоўчыя з'явы, так і адмоўныя, якія ставілі даволі вострыя пытанні. Шэраг з іх (асабліва фінансавае забеспячэнне камплектавання) самастойна пераадолець кіраўнікам і спецыялістам бібліятэк немагчыма, таму што дзейнасць такой ўстановы, як публічная бібліятэка залежыць ад многіх фактараў, пачынаючы з сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне і рэгіёне, дзяржаўнай і мясцовай палітыкі ў галіне культуры і бібліятэчнай справы, а таксама ад ініцыятывы саміх бібліятэк. Таму асаблівая ўвага павінна надавацца не толькі аналізу і фарміраванню беларускамоўных бібліятэчных фондаў, але і дзейнасці бібліятэк па іх распаўсюджанні.

Літаратура:

1. Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь: Закон Рэспублікі Беларусь ад 22.03.1995г. № 3680- XII (у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 31. 12. 2009г., № 114-З) // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2010. – № 15.– С. 96.
2. «Няма каго байкатаваць»: беларускія прыватныя выдаўцы не супраць аб'яднацца [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http: news. tut.by / cultrure / art 16/023. html. – Дата доступу: 15.03.2010.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кніжна-ілюстрацыйная выстаўка “Лепшыя кнігі Беларусі” [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http: www. nlb / portal / page / portal / index / detailed news ? param 0= 15558&lang=. – Дата доступу: 25.02.2010.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ